**Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі прыдумаў арыгінальны спосаб баўлення вольнага часу моладзі. Па яго ініцыятыве ў лістападзе бягучага года ў краіне стартуе рэспубліканскі чэмпіянат па зборы пазлаў "Беларусь і я". Прыняць удзел у інтэлектуальна-забаўляльных спаборніцтвах змогуць навучэнцы сярэдніх спецыяльных, прафесійна-тэхнічных і вышэйшых навучальных устаноў краіны. Для гэтага ім неабходна аператыўна сфарміраваць каманду, падаць заяўку ў абласны (Мінскі гарадскі) камітэт БРСМ і быць гатовымі да пазнання, а можа нават і адкрыцця, Беларусі.**

# Вывучаць Беларусь... збіраючы пазлы



Псіхолагамі заўважана, што няхітрая на першы погляд забава не толькі выпрацоўвае ўважлівасць, трэніруе памяць, развівае стратэгічнае мысленне, але і вучыць працаваць у камандзе. Арганізатары чэмпіянату дадаюць, што правядзенне падобных спаборніцтваў будзе спрыяць і вывучэнню гісторыі і геаграфіі сваёй краіны, бо ўдзельнікі з мноства дробных дэталяў будуць збіраць не заморскія пейзажы ці муль-

тыплікацыйных герояў, а знакавыя аб'екты нашай краіны. З распрацоўкі і вырабу беларускіх пазлаў уласна і пачалася падрыхтоўка да незвычайнага спаборніцтва.

У тройку першых конкурсных аб'ектаў увайшлі карта Беларусі, будынак Нацыянальнай бібліятэкі і комплекс "Мінск-Арэна".

— Мы хочам, каб гісторыю і геаграфію роднай Беларусі моладзь вывучала не толькі па падручніках, але і ў працэсе гульні, — гаворыць першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Ігар Бузоўскі. — Таму даведацца, дзе знаходзіцца Шаркаўшчына ці Буда-Кашалёва, цяпер будзе значна цікавей і прасцей. Хацелася б, каб, акрамя геаграфіі, моладзь ведала і знакавыя аб'екты сваёй краіны, пабудаваныя ў перыяд навейшай гісторыі пад патранажам прэзідэнта, а таксама аб'екты культурна-гістарычнай спадчыны.

Упершыню міні-спаборніцтвы па зборы пазлаў былі праведзены падчас прэзентацыі маладзёжнага форуму "Зрабі свой выбар" у Футбольным манежы Мінска. Стэнд з пазламі карыстаўся вялікай папулярнасцю. "Студэнты, школьнікі і дарослыя з задавальненнем шукалі Шаркаўшчыну, Давід-Гарадок і Буда-Кашалёва, складаючы карту Беларусі, ці ўдзельнічалі ў "будаўніцтве" Нацыянальнай бібліятэкі", — адзначыў Ігар Бузоўскі.

Спаборніцтвы па зборы пазлаў "Беларусь і я" пройдуць у два этапы: абласныя адборачныя туры сярод устаноў адукацыі ў абласцях і Мінску (да 11 лістапада) і рэспубліканскі (19 лістапада). У рэспубліканскі тур, які будзе складацца з трох этапаў і фіналу, пройдзе сем каманд з ліку вучнёўскай моладзі сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў і сем каманд з ліку студэнтаў ВНУ. За званне чэмпіёна ў фінале спаборніцтваў падчас інтэлектуальнага "Эрудыт-лато" паспрачаецца ўжо шэсць лепшых каманд краіны. Пераможцай рэспубліканскага чэмпіянату па зборы пазлаў будзе названа тая каманда, якая правільна адкажа на найбольшую колькасць пытанняў.

Нягледзячы на тое, што правядзенне абласных тураў чэмпіянату "Беларусь і я" запланавана на пачатак лістапада, ужо сёння ў ВНУ, ССНУ і ПТНУ актыўна праходзяць папярэднія турніры-спаборніцтвы і ўстанаўліваюцца рэкорды. Напрыклад, падчас пробных спаборніцтваў у Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі зборная каманда факультэта тэлекамунікацый сабрала пазлы фармату А4 з малюнкам карты Рэспублікі Беларусь за 2 хвіліны 13 секунд! Падчас маладзёжнага форуму "Зрабі свой выбар" рэкорд па зборы аналагічнай мазаікі склаў 6 хвілін 4 секунды.

Адзначым, што пазлы былі вынайдзены ў Англіі ў 1761 годзе. Джон Спілсберы, лонданскі гандляр геаграфічнымі картамі, прыдумаў новы вучэбны дапаможнік. Ён стаў наклейваць геаграфічныя карты на драўляную аснову і разразаць яе на дробныя дэталі мудрагелістай формы. Кожны такі кавалачак змяшчаў крышачку геаграфічнай інфармацыі, і, збіраючы элемент за элементам, вучань такім чынам вывучаў геаграфію. На пачатку мінулага стагоддзя ў Амерыцы вынайшлі пазлы з кардону. Гэта дазволіла істотна зменшыць іх кошт і ў выніку прывяло да шырокай папулярнасці ва ўсім свеце. З развіццём высокіх тэхналогій з'явіліся і віртуальныя пазлы і нават анлайн-чэмпіянаты па іх зборы.

— Паколькі ініцыятыва правядзення чэмпіянату па зборы пазлаў зыходзіла ад студэнцтва, то ў першы раз ён будзе праходзіць сярод навучэнцаў сярэдніх спецыяльных, прафесійна-тэхнічных і вышэйшых навучальных устаноў краіны. Але ў наступны раз мы абавязкова ўключым у спіс удзельнікаў і школьнікаў, бо яны, даведаўшыся пра тое, што будзе праводзіцца такі чэмпіянат, таксама выказалі жаданне ўдзельнічаць у ім, — гаворыць Ігар Іванавіч. — Больш за тое, мы спадзяёмся, што наш чэмпіянат выклікае цікавасць і ў Міністэрства адукацыі і, магчыма, на ўроках геаграфіі і гісторыі Беларусі беларускія пазлы будуць выкарыстоўвацца як наглядныя дапаможнікі.

Ёсць у арганізатараў чэмпіянату яшчэ адна цікавая ідэя: у бліжэйшы час запусціць пазлы ў масавую вытворчасць, каб кожны жадаючы, беларус ці замежны турыст, мог набыць сабе такі сувенір.

**Марына ПЫРКОВА.**
**Фота БелТА.**